# Што такое мова варожасці

**Мова варожасці – гэта ўсе формы самавыяўлення, якія адмаўляюць роўнасць усіх людзей і распальваюць нянавісць або ксенафобію да людзей паводле таго, кім яны з’яўляюцца.**

Напрыклад, зыходзячы з рэлігіі, этнічнай прыналежнасці, нацыянальнасці, расы, колеру скуры, сэксуальнай арыентацыі, полу, узросту ці іншага фактару, які вызначае чалавека.

Мова варожасці можа быць формай праяўлення расізму, ксенафобіі, міжнацыянальный варожасці і нецярпімасці, гамафобіі, эйджызму ды сэксізму.

Мова варожасці можа прымаць **розныя формы**: вусную, пісьмовую, візуальную і невербальную.

Выкарыстанне мовы варожасці прыводзіць да ізаляцыі і дыскрымінацыі пэўных груп людзей у грамадстве, можа справакаваць злачынствы на глебе нянавісці і нават прывесці да генацыду.

Самыя небяспечныя праявы мовы варожасці – гэта прамыя і завуаляваныя заклікі да дыскрымінацыі або гвалту, таму міжнародныя законы забараняюць такія выказванні.

Да мовы варожасці можна таксама аднесці стэрэатыпы і выказванні, якія апісваюць людзей як асоб другога гатунку, сцвярджэнні аб крымінальнасці якой-небудзь групы, а таксама стыгматызуючую лексіку.

## Калі мова варожасці так небяспечна, то чаму не забараніць яе цалкам?

Справа ў тым, што, акрамя права на роўнасць, у людзей ёсць права на свабоду выказвання меркавання, таму забараняюцца толькі самыя небяспечныя выказванні.

Забароны не могуць перамагчы негатыўныя стэрэатыпы і дыскрымінацыю, але іх можа перамагчы кожны і кожная з нас, выхоўваючы талерантнасць і павагу адзін да аднаго.

**Тэкст:** Алег Ражкоў

Крыніца: https://theothersby.org/shto-takoe-mova-varozhastsi-videa/